**ТУРЖЭ́Ц 2**, археалагічны помнік – грунтавы могільнік 17–18 ст. каля в. Туржэц 2 Полацкага р-на Віцебскай вобл. За 0,3 км на У ад вёскі, на вясковых могілках. Сяло Турэц вядома з 1533, у 1624 увайшло ў маёмасць полацкага Барысаглебскага уніяцкага кляштара. Могільнік адкрыў ў 2004 І.А.Елісееў, даследаваў у 2005–06 Дз.У.Дук. Старажытныя пахаванні размешчаны ў цэнтры сучасных вясковых могілак, бліжэй да іх усх. часткі, на пл. каля 0,32 га (агульная пл. могілак 1,6 га). Стараж. могілкі размешчаны радамі па лініі ПдЗ–ПнУ. Пахаванні ўяўляюць сабой выцягнутыя ў накірунку ПдУ–ПнЗ ладдзепадобныя агароджы з камянёў даўж. каля 1,5–2 м, шыр. каля 1 м. Памеры камянёў у сярэднім каля 0,4 м, асобныя – больш за 1 м. З паўн.-зах. боку, як правіла, размешчаны вял. камень з салярнай сімволікай, выявамі крыжоў, крыжа ў паўколе. Усе выявы высечаны на камянях бароздамі глыб. 1–2 см. Удалося дакладна вызначыць 12 радоў пахаванняў з рознай ступенню захаванасці, якія размяшчаліся ў цэнтр. частцы могільніка. У 2006 даследавана 3 пахаванні 18–19 ст. у драўляных трунах (астанкі жанчыны ва ўзросце больш за 60 гадоў, дзяўчынкі 4–5 гадоў, мужчыны 40–50 гадоў). Пахавальны інвентар знойдзены ў магіле дзяўчынкі. На месцы кожнага пахавання ўзводзілася складаная канструкцыя – дамавіна з дрэва, якая спальвалася. Кавалкі вугалю, знойдзеныя ў зямлі над трунамі, сведчаць аб тым, што перад пахаваннем пляцоўка выпальвалася. Для будаўніцтва каменных агароджаў у галовах і зрэдку ў нагах нябожчыка, выкарыстоўвалі камяні са знакамі.

*Літ.*: Д у к Дз.У. Археалагічныя раскопкі на грунтавым могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна // Археалогія эпохі сярэднявечча: да 80-годдзя з дня нарадж. Г.В. Штыхава // МАБ. 2008. Вып. 15. *Дз.У.Дук.*